Бібліятэка навукова-пазнавальнай літаратуры

**АЛЕСЬ КРАЎЦЭВІЧ**

# Гродзенскі замак





У ДАЎНІЯ ЧАСЫ
НАШЫЯ ПРОДКІ,
КАБ БАРАНІЦЦА
АД ВОРАГАЎ,
БУДАВАЛІ ЗАМКІ.
АДНЫМ З ТАКІХ
МАГУТНЫХ
І НЕПРЫСТУПНЫХ
УМАЦАВАННЯЎ
КАЛЯ ЗАХОДНЯЙ МЯЖЫ
БЕЛАРУСІ
БЫЎ ЗАМАК У ГАРОДНІ.

Бібліятэка навукова-пазнавальнай літаратуры

АЛЕСЬ КРАЎЦЭВІЧ

# Гродзенскі замак

Нарыс



Мінск «Юнацтва» 1993

ББК 38.711
К 78

Серыя заснавана ў 1988 годзе

Рэцэнзент Г. В. ШТЫХАЎ, загадчык аддзела археалагічных даследаванняў Інстытута гісторыі АН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар

Мастакі Ф. Я. Селязнёў, С. В. Харэўскі

*Для малодшага школьнага ўзросту*

К $\frac{4802010000-013}{М 307(03)-93}$ 7—92

ISBN 5-7880-0479-9

© А. К. Краўцэвіч, 1993
© Афармленне. Ф. Я. Селязнёў, С. В. Харэўскі, 1993

*У даўнія часы нашыя продкі, каб бараніцца ад ворагаў, збудавалі мноства замкаў. Чаго-чаго, а ворагаў тады хапала. Шмат разоў прыходзілі па здабычу на нашу зямлю немцы-крыжакі, крымскія татары, маскавіты, шведы.*

*Найбольш магутныя замкі ўзводзіліся на граніцах у самых небяспечных месцах, вось як у Полацку, Віцебску або Смаленску, Мсціславе ці Оршы. Гэтыя гарады знаходзіліся каля ўсходняй мяжы Беларусі і на выпадак вайны з Маскоўскай дзяржавай мелі вялікія і добра ўмацаваныя замкі. Тое ж было і на захадзе. Тут самае буйное будаўніцтва замкаў адбывалася ў другой палове 13 і ў 14 стагоддзях, калі патрэбна было адбівацца ад вельмі небяспечнага ворага — крыжакоў.*

*Магутным і непрыступным умацаваннем каля заходняй мяжы Беларусі быў замак у горадзе Гародня (зараз Гродна). Шмат разоў нападалі на яго ворагі і амаль заўсёды бясслаўна адступалі.*

*Мы хочам расказаць аб гісторыі гарадзенскага замка з самага пачатку яго існавання і да нашых дзён. Гісторыя гэта багатая на розныя падзеі, сумныя і радасныя. Спадзяёмся, што яна будзе вам цікавая, гэтак жа як і лёс людзей, якія жылі ў замку, бараніліся на яго мурах, выпраўляліся адсюль у паходы.*


X ст.

# УЗНІКНЕННЕ І РОСКВІТ ПАСЕЛІШЧА НА БЕРАЗЕ НЁМАНА

Стары замак у Гародні — невялікае па плошчы (менш за 1 гектар), але вельмі прыгожае месца. Даўным-даўно людзі аблюбавалі яго пад жыллё і жывуць тут амаль тысячу гадоў. Назва «Стары замак» з'явілася не так даўно — у другой палове 18 стагоддзя, пасля таго як па суседству збудавалі Новы замак. Дагэтуль гаварылі «Замак», раней «Верхні замак», яшчэ даўней — «Дзядзінец», а на самым пачатку тут мясцілася ўся Гародня.

Людзі, якія заснавалі першае паселішча, былі нашымі продкамі — усходнімі славянамі. Яны прыйшлі сюды ў канцы 10 стагоддзя. А землі навокал належалі іншым плямёнам, блізкім па паходжанню да літоўцаў і латышоў.

Знаходзіцца Стары замак на самым беразе Нёмана. Берагі ракі тут высокія і стромкія, гэтаксама як і ў невялікай рэчкі Гараднічанкі, якая ўпадае ў Нёман ля самай падэшвы Замкавай гары.

Калі паглядзець на Стары замак зверху, то добра відаць, што ён мае абрысы трохкутніка. Рэчышчы Нёмана і Гараднічанкі — гэта два бакі, а трэці бок трохкутніка стварае глыбокі роў. Прайсці на замак можна толькі праз мост над ровам. У старажытнасці на месцы рова, відавочна, быў яр. Жыхары замка дакапалі яго, зраўнялі сценкі і ператварылі ў непраходны роў. Яны гэта зрабілі, каб яшчэ болей ускладніць доступ да свайго жылля. У тыя далёкія часы людзі маглі жыць больш-менш спакойна толькі на такой вось цяжкадаступнай, ды яшчэ добра ўмацаванай мясціне.



Канец 10 — пачатак 11 стагоддзя



І пазней не змяншалася пагроза то з боку суседніх пляменаў і дзяржаў, то з боку хаўрусаў рабаўнікоў, якія плавалі па Нёмане. Жыхары Старога замка пастаянна ўмацоўвалі сваю мясціну, ладзілі магутныя абарончыя збудаванні.

Паступова нашыя продкі добра асвоілі землі Панямоння і стварылі тут асяродак высокаразвітай культуры. З часам змяняўся і воблік Гародні. Паселішча моцна разраслося. У 12 стагоддзі каля зліцця Гараднічанкі і Нёмана на месцы першага паселішча стаяў непрыступны замак.

З дапамогай археалогіі — гістарычнай навукі, якая вывучае мінулае шляхам спецыяльных раскопак, мы можам уявіць тагачасны выгляд замка. Вось ён...

Вакол усёй гары праходзіць высокі земляны вал. Яго насыпалі не на пустое месца, а на спецыяльныя драўляныя канструкцыі, якія ўмацоўвалі зямлю, не давалі ёй асыпацца. Паверх вала цягнецца сцяна, складзеная з таўшчэзных — як абхапіць рукамі — бярвёнаў. Высока ў неба імкнуць драўляныя вежы з байніцамі. У адным месцы, над вусцем Гараднічанкі, сцяна замка складзена не з дрэва, а з тонкай і шырокай цэглы — плінфы.

Замак, які ў тыя часы называўся дзядзінцам, падчас небяспекі даваў прытулак і людзям, што жылі за яго межамі.

На дзядзінцы жыў князь з сям'ёй, дружынай і чэляддзю. Для яго збудаваны вялікі мураваны церам. У гэтым будынку адбываліся ўсялякія ўрачыстыя цырымоніі: прыём паслоў, нарады князя са сваімі саветнікамі. Побач жылі княжацкія дружыннікі і ўся абслуга: чалядзіны і чаляднікі. Іх невялікія драўляныя будынкі займалі значную частку замкавага двара.

У замку была ўзведзена вялікая мураваная царква. Сваім незвычайным выглядам яна адразу прыцягвала ўвагу ўсіх прыезджых людзей. Звонку сцены храма ўпрыгожаны шліфаванымі камянямі і глінанымі пліткамі. Камяні падбіраліся розных колераў, пліткі пакрываліся спецыяльнай яркай палівай жоўтага, зялёнага і карычневага колераў. Разнастайныя па форме крыжы,


XII ст.

выкладзеныя на мурах з плітак, добра спалучаліся з рознакаляровымі камянямі.

З такіх жа плітак быў выкладзены ўзор падлогі храма. Калі праз вузкія і высокія вокны сонечныя промні траплялі на падлогу, пліткі прыгожа зіхацелі ў паўзмроку. Знутры царквы ў сцены ўмуроўваліся галаснікі — вялікія збаны. Горла іх выходзіла ў царкву, і здавалася, што ўсе сцены ў цёмных дзірках. Галаснікі стваралі ў храме цудоўную акустыку, голасна і прыгожа гучалі малітвы і спевы.

Людзі прыходзілі да царквы не толькі на набажэнства, але і палюбавацца на хараство, створанае рукамі таленавітых майстроў.

Высокая, з дасканалымі прапорцыямі, зіхацістая, як вясёлка, яна выдзялялася сярод невялікіх драўляных будынкаў Старога замка.

Скупыя радкі старажытнага летапісу паведамляюць, што ў 1183 годзе горад Гародня пагарэў ад маланкі. Магчыма, ад пажару пацярпела і царква на дзядзінцы. Археолагі раскапалі яе ў 1932 годзе. Ад храма засталіся толькі руіны — рэшткі сцен і слупоў. Яны былі пакрыты шматметровым слоем зямлі, які накапіўся за 800 гадоў. Царкву археолагі назвалі Ніжняй, бо над яе руінамі ў 14 — 15 стагоддзях была збудавана другая царква, якую назвалі Верхняй. Сапраўдныя назвы гэтых храмаў не вядомыя.

У час раскопак Ніжняй царквы знойдзена вялікая колькасць тонкай цэглы плінфы 12 стагоддзя, рознакаляровыя керамічныя пліткі, шліфаваныя камяні, кавалкі збаноў галаснікоў, кавалкі званоў, бронзавая фігурка Хрыста, складныя крыжы, узорная падлога. Усе гэтыя знаходкі дазволілі аднавіць воблік старажытнага храма.

Самымі паважанымі прыхаджанамі царквы былі гарадзенскія князі. Летапісы даносяць да нас іх імёны. Першы — Усеваладка, ён ажаніўся з дачкой вядомага кіеўскага князя Уладзіміра Манамаха. Сыноў Усеваладкі звалі Барыс, Глеб і Мсціслаў. Пад кіраўніцтвам гэтага княжацкага роду гарадзенскі дзядзінец стаў магутным умацаваннем.

Да замка князі збіралі свае вайсковыя сілы, адсюль выпраўляліся ў паходы. На жаль, не захаваўся гарадзенскі летапіс,і пра справы гарадзенцаў мы даведваемся з летапісаў іншых усходнеславянскіх земляў. А яны больш цікавіліся сваімі справамі і згадвалі толькі пра важнейшыя тутэйшыя падзеі, вось як пра вялікі пажар ці сумесныя ваенныя выправы.

У 1127 годзе гарадзенскае войска прымала ўдзел у вялікім паходзе на Полацкую зямлю, а ў 1141 годзе хадзіла на Галіч разам з атрадамі кіеўскіх князёў. У выдатным літаратурным творы тых часоў «Слове аб паходзе Ігаравым» таксама ёсць напамін аб Гародні: «... трубы трубяць гарадзенскія».

У сярэдзіне 13 стагоддзя на землі ўсходніх славянаў абрынуліся незлічоныя орды мангола татараў. Крывапралітная вайна, якая распачалася на поўдні і ўсходзе, не дасягнула Гародні. Праўда, некаторыя пісьмовыя крыніцы паведамляюць аб знішчэнні татарамі гарадоў Панямоння. Але археолагі не знайшлі слядоў жахлівай бітвы і разбурэнняў, як гэта было ў Кіеве і іншых паўднёвых гарадах.

У тыя страшныя часы, калі навокал панавалі вайна і смерць, нашым продкам патрэбна было клапаціцца аб сваёй абароне. Яны ствараюць на Панямонні новую дзяржаву Вялікае княства Літоўскае. Гародня са сваім магутным замкам стала адной з надзейных апораў княства.

Заваёўваць Гародню неаднаразова прыходзілі галіцка-валынскія князі. У тыя часы іх дзяржава была самай магутнай сярод усіх усходнеславянскіх. Галічанам некалькі разоў удавалася захапіць горад, але ненадоўга. У 1253 годзе галіцкі кароль Даніла Раманавіч заваяваў Гародню, але замацаваць тут сваю ўладу не змог. У 1259 годзе яму зноў давялося браць яе прыступам.

Гарадзенцы запрасілі на дапамогу ваяўнічых правадыроў літоўскіх плямёнаў. Летапісы паведамляюць, што ў 1270 годзе ў Гародні княжыў Трайдэн — літовец па паходжанню.





*Выхад князя (12 ст.)*

## КРЫЖАЦКАЯ НАВАЛА

У канцы 13 стагоддзя гарадзенцам давялося сутыкнуцца з самым страшным за ўсе часы ворагам — крыжакамі. Хто яны такія,крыжакі? Як з'явіліся на нашай зямлі? Гэта рыцары Тэўтонскага ордэна. Яны абвясцілі сваёй мэтай зварот язычнікаў* у хрысціянства. На белых плашчах рыцары ордэна насілі выяву крыжа. Яны давалі клятву несці святы хрысціянскі крыж да паганых**. Быццам бы з такой мэтай крыжакі ў 1226 годзе прыйшлі з Германіі на землі прусаў (зараз Калінінградская вобласць) і да 1386 года поўнасцю захапілі іх. Тых з прусаў, хто супраціўляўся, забівалі, астатніх прымусілі верыць у Хрыста, гаварыць па-нямецку. У выніку народ прусаў перастаў існаваць.

І вось немцы твар у твар сутыкнуліся з беларусамі і літоўцамі. Крыжакі, якія лічылі сябе ўзорнымі хрысціянамі, не звярталі ўвагі на тое, што беларусы таксама вераць у Хрыста. Галоўнай мэтай тэўтонаў быў захоп новых земляў і пакарэнне народаў, якія на гэтых землях жылі.

Гародня са сваім замкам знаходзілася на самым пярэднім краі вайны. Дзядзінец называўся ўжо Верхнім замкам, бо на суседняй гары збудавана дапаможнае ўмацаванне — замак Ніжні.

Жахлівая крывавая барацьба, якая цягнулася больш за сто дваццаць гадоў, закончылася поўным разгромам Тэўтонскага ордэна.

Стары замак у Гародні з гонарам вытрымаў усе бітвы, і калі ворагам удавалася ўзяць верх над яго абаронцамі, то ненадоўга. Сотні і тысячы разоў сцены замка прымалі на сябе страшэнныя па сіле ўдары вялізных камянёў, пушчаных з камнекідальных машын. Неаднойчы ваколіцы агалошваліся дзікімі крыкамі ворагаў, якія ішлі на прыступ, і ляскатам зброі. Шмат абаронцаў зложыла галовы

---

* Язычнікі — так называлі народы, у якіх не было хрысціянскай рэлігіі.

** Паганыя — тое ж, што і язычнікі.

на замкавых мурах і пахавана ў руінах Ніжняй царквы і на гарадскіх могілках.

Звесткі аб тых баях мы маем праз крыжацкія хронікі. Сведчанне варожага храніста — лепшая ацэнка баявой славы гарадзенцаў. Мы падрабязна раскажам аб гэтым самым цяжкім перыядзе гісторыі Старога замка. Замак і яго абаронцы вартыя таго.

Паратунку ад крыжакоў у нас шукалі прусы. У 1276 годзе князь Трайдэн пасяліў у Гародні частку прусаў, якіх прывёў іх правадыр Скурдо. Славянскі летапісец піша, што калі галіцка-валынскае войска ў 1277 годзе хацела захапіць Гародню, то прусы зачыніліся ў высокай мураванай вежы перад замкам. Нельга было нікому прайсці да горада, бо яны пабівалі ўсіх з вежы. Праз гэты невялікі радок з летапісу мы ведаем аб існаванні ў 13 стагоддзі на Старым замку абарончага збудавання, падобнага на свайго знакамітага равесніка — Белую вежу ў Камянцы.

Гарадзенскі замак быў вельмі важным пунктам абароны, і рыцары-крыжакі стараліся любым коштам захапіць яго.

Крыжацкія набегі неслі бяду і смерць на нашу зямлю, наводзілі жах на мірных людзей. Але на шляху рабаўнікоў стаяў Стары гарадзенскі замак. Крыжакі баяліся заходзіць далёка ў глыб нашага краю, пакуль ім пагражаў удар ззаду — з Гародні. І немцы зноў і зноў лезлі на замак, але ўрэшце абламалі на ім зубы...

У 1284 годзе да Гародні падступіў з войскам правінцыйны магістр* ордэна Конрад Цірберг. Вядомы гісторык 19 стагоддзя Тэадор Нарбут, які старанна вывучаў крыжацкія хронікі, пісаў, што крыжакі прыйшлі пакараць прусаў, якія ўцяклі ад іх. Гэтыя прусы дапамагалі нашым воям у барацьбе з ворагам, вялі праз сваякоў, што засталіся ў Прусіі, разведку.

Правадніком у крыжакоў быў таксама прус па імені Скомунд, які раней жыў у Гародні. Перайшоўшы Нёман, немцы прыступілі да аблогі горада. Стралялі з лукаў,

* Кіраўнік правінцыі ордэна.



*Сутычка ў ваколіцы Гародні (зіма 1296 г.)*



арбалетаў, камнекідальных машын, рыхтавалі штурм. Залога* горада была спакойнай — спадзявалася на моц сваіх муроў. Калі немцы палезлі на сцены, пачалася страшэнная сеча. Ва ўжытку былі лесвіцы, вяроўкі з крукамі. Абаронцы спускалі вялізныя бярвёны і камяні, нямала выбіўшы крыжакоў. Усё ж пасля шматгадзіннага штурму крыжакі ўварваліся ў горад. Спалілі дамы, жыхароў каго забілі, каго забралі ў няволю. Пра замак нямецкая хроніка маўчыць. Верхні замак, відавочна, ацалеў, інакш храніст не прамінуў бы расказаць аб яго падзенні. Немцы ўзялі толькі Ніжні замак.

Здраднік Скомунд катаваў сваіх землякоў, якіх немцы захапілі ў палон. Ён загадаў замучыць старога правадыра прусаў.

Князь Віцень адбудаваў горад, вярнуў у яго тых жыхароў, якія здолелі ўцячы і хаваліся па лясах і балотах. Па загаду князя ўзведзены новыя ўмацаванні. З імем гэтага князя звязана з'яўленне беларускага дзяржаўнага герба. У Густынскім летапісе сказана, што ў канцы 13 стагоддзя Віцень узяў сабе герб: «рыцер збройны на коне с мечем, еже ныне. Наричут погоня».

Абаронцы Гародні многа ўвагі і сіл аддавалі на ўмацаванне замка. У 13 стагоддзі збудавана мураваная вежа, якая прыкрывала дарогу і мост да замка. Уваход самы небяспечны ўчастак абароны ўсіх замкаў. Яго стараліся як мага надзейней умацаваць.

У гарадзенскім замку мост з пасаду да брамнай вежы цягнуўся не прама да ўвахода, а загінаўся дугой пад самыя сцены. Усе, хто па ім ішоў, трапілі ў зону абстрэлу. Частка моста, якая прымыкала да брамы, была пад'ёмнай. Кожны вечар мост з грукатам падымаўся на моцных ланцугах, прыціскаўся да варот і ствараў такім чынам дадатковую заслону. Варта на вежы была гатова пры першай небяспецы падняць яго і днём. Але пад'ём моста справа даволі марудная, ворагі маглі папспець праскочыць у вежу і пераշкодзіць варце. Пры апушчаным перад ворагам мосце не дапамогуць ні кру-

* Залога — гарнізон.

тыя абрывы Замкавай гары, ні магутныя сцены. Нават калі вароты зачынены, іх можна выламаць таранам. Таму ў замку мелася яшчэ адно прыстасаванне для абароны варот. Гэта цяжкая сталёвая кратаўка, якая віселa над праходам. Яна называлася герса. Падчас небяспекі можна было імгненна перасекчы вяроўку, тады герса падала і перакрывала праход. Затым падымаўся мост і зачыняліся вароты.

Праз нейкі час пасля першага нападу крыжакі аж два разы за год спрабавалі захапіць Гародню. Гэта было у 1296 годзе. Спачатку зімой выправіўся з немалым войскам камандор* з Балгі Зігфрыд Райнберг. Падрабязна апісаны храністам адзін выпадак з гэтага паходу. Ён хвалюе нас і зараз, хоць адбыўся без малога семсот гадоў назад. Крыжакі наблізіліся да горада з левага берага Нёмана і натрапілі на свежыя сляды ваеннага атрада. Немцы кінуліся ў пагоню, дагналі невялікі атрад нашых вояў і пабілі іх. Толькі адзін беларус (храніст піша «русін») зваліў з каня рыцара і,хоць сам быў цяжка паранены, ускочыў у сядло і ўцёк. Тады крыжак Вальтэр кінуўся наўздагон па слядах крыві на снезе. Неўзабаве дагнаў чалавека, які, аслабеўшы ад раны, не мог ні хутка ехаць, ні бараніцца. Хроніка не данесла да нас імя гэтага героя — нашага продка. Мы ведаем толькі, як звалі забойцу. Вальтэр дабіў русіна і забраў каня.

Крыжакі перайшлі Нёман па лёдзе, напалі на навакольныя вёскі і спалілі дальняе прадмесце. Да замка падыходзіць збаяліся.

У той жа год, калі вялікі князь гасціў у Інфлянтах**, крыжакі вырашылі зноў напасці на Гародню. Яны лічылі, што без князя не будзе каму кіраваць абаронай. Крулявецкі камандор сабраў вялікую банду рабаўнікоў, паставіў іх пад камандай рыцара ордэна Генрыха Зухверта і накіраваў на Гародню. Аднак крыжакі пралічыліся. Абарона краю была добра арганізавана, не дапамагла ворагам і адсутнасць вялікага князя.

* Камандор — адзін з вышэйшых чыноў ордэна.

** Інфлянты — старая назва Латвіі.



*Крыжакі пад мурамі замка (канец 14 ст.)*



Немцы мусілі адысці ад муроў Гародні з вялікімі стратамі. З замка выскачыў моцны атрад і пагнаў рабаўнікоў так, што яны нават не маглі збочыць з дарогі для рабунку і забеспячэння прыпасамі.

Крыжакі і надалей імкнуліся падлавіць момант, каб ударыць нечакана і захапіць замак.

У маі 1306 года князь Віцень з войскам пайшоў у паход на Польшчу. Крыжацкія шпіёны тут жа данеслі аб гэтым у ордэн. Прускі магістр Конрад Сак вырашыў, што ў Гародні засталося мала вояў, і паспяшаўся выправіць сваё войска, у тым ліку 400 адборных кавалерыстаў. Крыжакі лічылі, што проста займуць замак, не сустрэўшы супраціўлення. Вораг далёка за горадам перайшоў Нёман і наблізіўся да Гародні. Моцная бура з громам, дажджом і градам прыкрыла падыход крыжакоў да самага горада. Яны нечакана напалі на прадмесце, пачалі рабаваць і забіваць. Залога Старога замка падрыхтавалася да адпору. Немцы мусілі адыходзіць, забраўшы з сабой тое, што паспелі, нават пажару не змаглі нарабіць з-за залевы.

Аднак літаральна ўслед надышло вялікае крыжацкае войска. У ім было за сотню рыцараў і шэсць тысяч коннікаў. На дапамогу замку падышло беларускае войска. На самым усходзе сонца распачалася бітва. Перавага была то на адным, то на другім баку. Бітва цягнулася да палудня. Нарэшце крыжакі не вытрымалі і адступілі з вялікімі стратамі. Быў забіты стралой адзін з найлепшых рыцараў ордэна Хартман Эльстэрбург.

Беларусы не толькі абараняліся ад крыжакоў у сваіх замках, але і рабілі паходы ў адказ. У 1311 годзе вялікі князь на чале свайго войска зрабіў паход на Прусы. Самландыя і Натангія былі спустошаныя, ні адзін атрад крыжакоў не адважыўся высунуць носа з умацаваных замкаў.

У той час у крыжацкай няволі знаходзіўся адзін ліцвін шляхетнага паходжання. Яго звалі Шамбелан, ён служыў пры двары вялікага князя. Гэты ліцвін паабяцаў крыжакам у абмен на волю аддаць замак і места Гародню. Хцівасць так засляпіла крыжакам вочы, што

сам вялікі камандор з войскам у пяць тысяч чалавек выправіўся па здабычу. Аднак ліцвін усё ж неяк паведаміў аб выправе князю Віценю. Падышоўшы да Гародні, крыжакі пад самым горадам злавілі старога, якога выправілі з замка на разведку. Ад яго даведаліся, што Віцень з агромністым войскам ужо чакае іх пад Гародняй і мае намер заспець падчас пераправы праз Нёман. Калі крыжакі падзеляцца, то частку іх знішчыць на месцы, а астатніх перабіць у пагоні. Вялікі камандор Генрых з Плоцка паспяшаўся вярнуцца туды, адкуль прыйшоў, але на гэтым не супакоіўся. У той жа год ён з вялікім войскам зноў прывалокся пад Гародню. Зноў каля горада злавілі чалавека, на гэты раз воя з пагранічнай варты. Яго вымусілі расказаць аб невялікім атрадзе, які выправіўся рыхтаваць вялікаму князю месца для палявання. І крыжакі тых людзей усіх пабілі.

## СЛАЎНЫ РЫЦАР ДАВЫД ГАРАДЗЕНСКІ

У 1314 годзе камандор Генрых, каб выправіць сваю пахіснутую рэпутацыю ваякі, рашыўся на справу, на якую дагэтуль ні адзін крыжацкі правадыр не адважваўся. Ён задумаў зайсці далёка ў тыл Гародні і напасці на Наваградак. Сабраў вялікае войска, нарыхтаваў на чатыры месяцы харчавання і ў верасні пайшоў пішком праз Наднарвянскую пушчу. Мінуўшы трэцюю частку дарогі, загадаў пакінуць у лесе пад вартай нейкую колькасць прадуктаў, каб на зваротным шляху было чым падмацавацца. Затым далей, ужо насупраць Гародні, у лесе таксама пакінулі склад і паўтары тысячы коней з вартай у 30 лепшых жаўнераў.

Нашыя воі рабілі крыжакам усякія перашкоды, палілі вёскі і хавалі жыхароў. Былі спустошаныя і ваколіцы Наваградка. Пасля некалькіх прыступаў крыжакі ўзялі спалены вакольны горад, гараджане зачыніліся ў замку. У крыжакоў не было ні здабычы, ні палонных, іх абоз пад замкам стаяў пусты. Наваградчане мужна бараніліся, рабілі вылазкі з-за валоў і муроў. Праз нека-





*Давыд Гарадзенскі*

торы час крыжакам не стала хапаць ежы, яны баяліся ў пошуках яе адыходзіць далёка ад свайго войска. Вырашылі вяртацца назад. Спешна прыйшлі да першага склада, але там яны не знайшлі ні коней, ні запасаў, а толькі трупы варты. Гэта Давыд — гарадзенскі староста* напаў з дружынай, варту пабіў і ўсё забраў. У войску крыжакоў пачаўся голад, яно накіравалася да другога склада, але і там было пуста. І тут пабываў Давыд. У дрымучай пушчы войска ахапіла роспач, коні пагінулі або былі з'едзеныя, ніхто не меў кавалка хлеба. Воі рассыпаліся па пушчы, кожны паасобку шукаў харчавання ў лесе і прабіраўся да свайго краю. Многа памерла, многіх злавілі нашыя воі. Некаторыя з немцаў, якія вярнуліся дадому, упалі ў невылечныя хваробы. Хроніка паведамляе, што тыя, хто вярнуўся, былі падобныя да страшыдлаў, нібы з магіл выйшлі. Гэты паход на Беларусь доўга памяталі на Прусах.

У апісанні пахода на Навагрудак называецца імя Давыда — гарадзенскага старосты. Гэта быў мужны энергічны чалавек, вопытны і таленавіты военачальнік. Неўзабаве яго сталі называць Давыдам Гарадзенскім. Ён здолеў арганізаваць крыжакам рашучы адпор — не толькі адбіваць іх напады, але рабіць паходы ў адказ і дапамагаць іншым усходнеславянскім дзяржавам, напрыклад, Пскову.

Вясной 1319 года староста Давыд, ці, як яго называлі крыжакі, кашталян**, узяўшы з сабою 800 чалавек,

* С т а р о́ с т а — службовая асоба, якая ўзначальвала мясцовае кіраванне.

** К а ш т а л я н — камендант замка, памочнік ваяводы.

пайшоў у паход на Прусы, там паставіў усюды засады і, набраўшы многа здабычы, павярнуў назад. Тым часам крыжакі паспелі зламаць мост і здолелі затрымаць войска Давыда, пакуль сабралі свае сілы. Адбылася бітва, пасля якой Давыд вярнуўся дадому, пакінуўшы здабычу.

У 1323 годзе Пскоўская рэспубліка паскардзілася Давыду на крыжакоў, якія пазабівалі пскоўскіх паляўнічых, рыбакоў і купцоў. Давыд з дазволу вялікага князя набраў маладых ахвотнікаў, пасярод зімы ўварваўся ў Эстонію, вярнуўся з перамогай. Крыжакі ў той жа год аблажылі Пскоў, пскавічы паслалі ганца да Давыда з просьбай аб дапамозе. Той падышоў з дружынай, напаў на крыжацкі абоз, забраў яго, а таксама ўсю здабычу, абложныя машыны, харугвы, разграміў лепшую частку нямецкага войска. Крыжакі былі вымушаны прыняць 18-гадовае перамір'е з Псковам. Давыд ахвотна дапамагаў Пскову яшчэ і таму, што меў з гэтай рэспублікай даўнія сувязі. Яго бацька быў пскоўскім князем.

Крыжакі ненавідзелі і баяліся Давыда. Яны вырашылі адпомсціць яму асабіста і напалі на яго ўласны маёнтак. 13 рыцараў і 600 коннікаў разрабавалі і спалілі Давыдзішкі.

У 1326 годзе Давыд Гарадзенскі быў па-здрадніцку забіты. Ён вяртаўся з войскам праз Мазовію пасля паспяховага паходу на крыжакоў. Забойцам стаў мазавецкі шляхціц Анджэй Гасціцкі. На прывале, калі воі паілі коней, ён знянацку, ззаду напаў на Давыда, прабіў яго дзідай і ўцёк. Забойцу доўга праследавалі, але не дагналі. Смерць Давыда — мужнага і таленавітага правадыра — была вялікай стратай для гарадзенцаў і не толькі для іх.

## БІТВА З КРЫЖАКАМІ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

У сярэдзіне 14 стагоддзя на беларускія землі прыйшла бяда, страшнейшая за крыжакоў: эпідэмія бубоннай чумы, якую называлі чорнай смерцю. Чума прынесла страшэнныя спусташэнні ўсёй Еўропе, не мінавала



*Забойства Давыда Гарадзенскага*



яна і Гародню. Археалагічныя раскопкі паказваюць, што тэрыторыя горада ў гэты час значна паменшылася. Людзі часткай паўміралі, часткай паўцякалі з горада. Але не спынялася жыццё на гарадзенскіх замках. Праз раскопкі відаць, што людзі тут жылі пастаянна. У 1360 годзе зноў быў мор, такі ж страшны, як і чорная смерць.

Тым не менш крыжакі не спынялі свае напады, і нашыя продкі напружвалі ўсе сілы, каб у такіх страшных варунках не загінуць, каб выратаваць свой народ.

У 1361 годзе крыжакі прыйшлі на Гародню, але нашыя воі не далі ім пераправіцца праз Нёман.

Рыцары-крыжакі — рабаўнікі і гвалтаўнікі — падманвалі ўвесь свет, выдаючы вайну з беларусамі як святое змаганне за хрысціянскую веру. І ім верылі.

Так, напрыклад, у 1363 годзе да немцаў-крыжакоў прыбылі рыцары з Англіі і Шатландыі, каб выступіць супраць язычнікаў. Пайшлі ўсе разам на вялікі пост да Гародні, дзе кіраваў князь Пацірг.

Калі войска крыжакоў падышло да горада, князь выслаў насустрач жыхароў з хлебам і соллю. У дэлегацыі былі святары з крыжамі і іншымі хрысціянскімі знакамі. Замежныя рыцары, якія ішлі ваяваць за Хрыста, не адважыліся адвергнуць хрысціянскае прывітанне, прынялі хлеб-соль. Затым выказалі абурэнне крыжакам і адышлі ад горада. За імі пайшлі і пасаромленыя тэўтоны.

У 1370 годзе крыжакі ліхаманкава рыхтаваліся да вайны, але на гэты раз небяспека пагражала ім самім. Беларусы і літоўцы ўварваліся ў Прусы двума войскамі: адно з Гародні пад кіраўніцтвам Кейстута прайшло праз пушчу, знянацку напала на крыжацкі замак Орстэльбург, з першага налёту выбіла залогу і спаліла замак. Затым Кейстут прайшоў праз усе Прусы і злучыўся з другім войскам пад кіраўніцтвам вялікага князя Альгерда. Тут адбылася ўпартая бітва з крыжакамі, пасля якой наша войска вярнулася дамоў.

## МІЖУСОБНЫЯ ЗВАДЫ, І КРЫЖАКІ Ў ЗАМКУ

Старому замку ў Гародні давялося прыняць удзел і ў міжусобнай вайне паміж сынамі Альгерда і Кейстута — Ягайлам ды Вітаўтам. Ягайла, які прыняў ад палякаў прапанову стаць іхнім каралём, хацеў яшчэ панаваць і ў Вялікім княстве Літоўскім.

У Гародні ў 1389 годзе Вітаўт сабраў сваіх прыхільнікаў, каб заваяваць сабе вялікакняжацкую карону. Яго падтрымала шматлікая беларуская шляхта, якая не хацела быць у залежнасці ад польскага караля. Па дапамогу супраць Ягайлы Вітаўт звярнуўся нават да злейшых ворагаў айчыны — крыжакоў. Тыя ахвотна далі Вітаўту войска. Распачалася вайна. Найгалоўнай апорай у Вітаўта была Гародня са сваімі замкамі. З летапісаў мы ведаем аб існаванні ў Гародні двух замкаў — Верхняга і Ніжняга. Верхні — гэта наш Стары, Ніжні быў там, дзе зараз Новы замак.

Вясной у 1390 годзе Ягайла з польскім войскам падступіў да Гародні. Два гарадзенскія замкі мелі адборную залогу і дасведчаных кіраўнікоў. Камандаваў абаронай крыжак Марквард Сальцбах. Сам Вітаўт у гэты час спяшаўся да Гародні з крыжацкай падмогай, вёз на вазах жыўнасць і прыпасы. Ягайла праводзіў штурмы розных калязамкавых умацаванняў, але ўсюды сустракаў упартую і добра арганізаваную абарону. Яшчэ да падыходу Ягайлавага войска крыжакі панішчылі навакольныя вёскі, было вясенняе бездарожжа, у войску польскага караля пачаўся голад.

Тым часам Вітаўт падышоў з другога боку Нёмана. Па яго загаду перацягнулі ланцуг праз раку пад муры Верхняга замка і пачалі наладжваць пераправу. Жаўнеры Ягайлы не маглі падысці да ланцуга, бо замкі панавалі над ракою. Аднак палякі пусцілі па імклівай рацэ вялізныя бярвёны, якія парвалі ланцуг. Летапіс паведамляе, што на гэта Вітаўт «з вялікай шкадобай» глядзеў. Работнікі з ланцуга papadalі ў ваду, адзін з іх, ратуючы жыццё, даплыў да правага берага і трапіў у рукі палякаў. Ад яго Ягайла даведаўся аб намерах Ві-



*Вітаўт*
*(кірваў у 1392—1430 гг.)*



*Ягайла*
*(кіраваў у 1377—1392 гг.)*

таўта. Нацiск на замкі ўзмацніўся, неўзабаве палякі захапілі Ніжні замак. Крыжакі з войска Вітаўта пачалі адыход. Залога здала Верхні замак Ягайлу пасля шасцітыднёвых бесперапынных штурмаў.

Вітаўт не збіраўся надоўга аддаваць Ягайлу горад і замкі. Ужо праз год яго войска акружыла Гародню. У Верхнім (Старым) замку Ягайла пакінуў залогу, якая часткова складалася з палякаў, але больш было русінаў і ліцвінаў*. Воі Вітаўта білі ў муры з гармат, але без асаблівага поспеху — сцены заставаліся цэлыя. Раптам у замку пачаўся пажар. У гэты час ліцвіны паўсталі, схапілі палякаў, замкнулі іх у нейкім будынку, а замак здалі Вітаўту.

Відавочна, за дапамогу супраць Ягайлы Вітаўт дазволіў крыжакам збудаваць два невялікія замкі на левым беразе Нёмана: адзін насупраць Гародні, другі далей. Гросмайстар** Тэўтонскага ордэна Конрад Валенрод

---

* Русіны, ліцвіны — старажытныя назвы беларусаў.
** Гросмайстар — вярхоўны кіраўнік ордэна.

прыслаў будаўнікоў і матэрыялы, хутка збудавалі замак, назвалі Ноенгардэн (Новая Гародня) і пасадзілі крыжацкую залогу.

## ЗАМІРЭННЕ ВІТАЎТА І ЯГАЙЛЫ

Неўзабаве Вітаўт дамогся свайго, прымірыўся з Ягайлам і зноў павярнуў супраць галоўнага ворага — крыжакоў.

На чале вялікага атрада Вітаўт нечакана захапіў Коўну*, затым паімчаўся ў Гародню, крыжакоў, якія там былі, кінуў у турму, пакінуў у замку сваю моцную залогу. Немцам у Ноенгардэне загадаў здацца, а калі тыя адмовіліся, пагражаў штурмам. Крыжакі здаліся, трапілі ў турму, а замак быў спалены.

Тэўтоны моцна раззлаваліся на Вітаўта. Крыжакі сабралі вялікае войска і пайшлі на Гародню. Вялікі князь у гэты час знаходзіўся на поўдні дзяржавы, уладкоўваў спрэчкі паміж мясцовымі князямі. На няшчасце, шматлікая залога Гародні (каля 4 тысяч чалавек), мела дрэннага камандзіра. Замкі трымаліся толькі тры дні, яны былі ўзятыя тэўтонамі. Многія абаронцы загінулі, тры тысячы людзей трапілі ў няволю. Горад быў спалены, замкі разбураны, ваколіцы спустошаны. Гэтае паведамленне хронік — першыя звесткі аб узяцці крыжакамі Старога замка.

23 мая 1398 года Вітаўт у Гародні падпісаў мір з крыжакамі. Але замірэнне гэтае доўга не трымалася.

У тым жа годзе вялікі князь ледзь не згарэў у гарадзенскім замку разам з жонкай. Сярод глухой ночы нечакана ўспыхнуў агонь у спальні. Ці то ад начной лямпы, ці ад печкі заняліся фіранкі і тканіна на сценах. На шчасце, у тым жа пакоі была прыручаная жывёліна — марскі коцік. Ён кінуўся на ложак і пабудзіў Вітаўта, той разам з жонкай паспеў выбегчы з полымя.

* Зараз горад Каўнас у Літве.

У 1401 годзе крыжакі зноў выкарысталі адсутнасць вялікага князя, калі ён знаходзіўся ў Кракаве. Яны напалі на ваколіцы Гародні, захапілі палонных і 300 коней. У часы княжэння Вітаўта моц нашай дзяржавы стала такой вялікай, што крыжакі не адважваліся малымі атрадамі ўступаць у яе межы. Пагранічная варта была моцная і добра арганізаваная.

Усё ж набегі крыжакоў працягваліся да рашаючай бітвы пад Грунвальдам. У 1410 годзе аб'яднанае войска беларусаў, палякаў, літоўцаў з дапамогай чэхаў, татараў ушчэнт разграміла ордэнскае войска. Толькі тады з крыжацкімі набегамі было скончана назаўсёды.

## ЗАМАК ВІТАЎТА

Стары замак упершыню стаў цалкам мураваным дзесьці ў 80-х гадах 14 стагоддзя. Відавочна, гэта адбылося пасля 1385 года, калі Ягайла аддаў замак Вітаўту. Апошнія дабудовы былі зроблены ў канцы 14 — пачатку 15 стагоддзяў. Замак шмат пацярпеў у час міжусобнай вайны і пазней ад крыжакоў. Ён моцна пагарэў падчас пажару, пра які мы ўжо ўпаміналі, але зноў быў адбудаваны.

Гэты замак дастаяў да 70-х гадоў 16 стагоддзя, у нас ёсць яго апісанні ў тагачасных дакументах і нават малюнак 1568 года. Да нашага часу захаваліся толькі часткі муроў замка Вітаўта. Іх вывучалі архітэктары, археолагі і зрабілі дакладную рэканструкцыю яго знешняга выгляду. Вядомы даўжыня сцен, колькасць вежаў і г. д. Памеры замка былі даволі значныя. Мураваная сцяна над Гараднічанкай мела даўжыню каля 90, сцяна з боку Нёмана — каля 120, ад горада — каля 46, сцяна з уязной вежай — каля 24 метраў. Над мурамі панавалі пяць вежаў: уязная вежа з брамай і пад'ёмным мостам, сярэдняя — з боку Нёмана, трэцяя — на самым мысе над вусцем Гараднічанкі, чацвёртая — у паўночна-ўсходнім куце з боку Нёмана і пятая — таксама


XIV ст.

з боку горада бліжэй да брамнай вежы. Толькі гэтая апошняя была круглай, астатнія мелі квадратную форму. Да нашага часу ніводная з іх не дажыла. Акрамя вежаў існаваў палац. Ён быў прыбудаваны да ўсходняй сцяны. Над руінамі царквы 12 стагоддзя (Ніжняй) збудавалі новую, значна меншую па памерах (так званая Верхняя царква).

Замкавыя сцены мелі да 3 метраў таўшчыні і былі выкладзеныя з буйных неапрацаваных камянёў. Прамежкі паміж камянямі закладваліся вялікімі цаглінамі. Частка муроў, галоўным чынам вежы, унутраныя паверхні сцен былі зробленыя з цэглы. Аблямоўка дзвярных і аконных праёмаў таксама выконвалася з цэглы. Сцены і вежы былі ўмацаваныя спецыяльнымі мураванымі падпоркамі-кантрфорсамі. Цяжкія муры моцна трымаліся на глыбокіх падмурках, якія засцерагалі ад варожых падкопаў у час аблогі.

У кожным сярэдневяковым замку была турма. Існавала яна і на Старым гарадзенскім. Знаходзілася турма, як звычайна, у падземным лёху брамнай вежы.

Раскопкі ў культурным слаі замка дапамаглі адшукаць шмат рэчаў. Сярод знаходак многа напамінкаў аб той страшэннай вайне, якая разгортвалася ў замку і пад яго сценамі. Часта трапляюцца наканечнікі балтоў — арбалетных стрэлаў. Арбалет — цяжкая зброя — ужываўся найчасцей падчас абароны і аблогі ўмацаванняў. Падрыхтоўка стрэлу з арбалета займала намнога больш часу, чым стрэлу з лука. Пакуль арбалетчык пускаў адну стралу, то лучнік пасвяваў стрэліць да шасці разоў. Прычым страла з лука ляцела далей. Але затое арбалетны болт меў значна большую пачатковую хуткасць палёту. Яго цяжкія гранёныя наканечнікі наскрозь прабівалі сталёвыя рыцарскія латы. Сярод знаходак трапляюцца вялікія круглыя каменныя ядры. Імі стралялі з каменекідальных машын, каб разбурыць сцены і вежы.

У 1988 годзе непадалёк ад Старога замка, дзесьці ў 1,5—2 кіламетры ніжэй па цячэнні Нёмана, некалькі гродзенскіх школьнікаў знайшлі незвычайны скарб.

У лесе ў абрыве ля самай вады яны адкапалі набор зброі і рыштунку коннага воіна 13 стагоддзя. Там былі меч, шлем, кальчуга, наканечнікі дзіды і дроціка, баявая сякера, стрэмя, тры шпоры, шпілька ад плашча. Гэта сапраўдны скарб, бо для нас знойдзеныя рэчы вельмі значныя як гістарычныя крыніцы. У тыя далёкія часы зброя дарага каштавала. Праз асаблівасці формы рэчаў вызначылі, што яны зроблены ўсходнеславянскімі (беларускімі) майстрамі. Таксама ўстаноўлена сувязь скарба са Старым замкам. Пры раскопках на замку археолагі знайшлі дакладна такі ж, як у скарбе, наканечнік дзіды. Цалкам магчыма, што гаспадар рэчаў — воін з замка. Прычым ён быў не простым воем. Такую зброю мог мець сама меней княскі дружыннік. Невядома, як трапілі рэчы на нёманскі бераг. Кальчуга была скручана ў камяк. Можа, вой сам схаваў свой цяжкі рыштунак, каб улегцы пераправіцца праз хуткі і глыбокі Нёман. Можа, ён нёс гарадзенцам важныя звесткі, напрыклад, аб нападзе крыжакоў.

Пасля перамогі над крыжакамі Стары замак паступова губляе значэнне магутнага абарончага збудавання. Ужо не было пастаяннай пагрозы нападаў. З суседнім польскім каралеўствам усталяваліся саюзныя адносіны. Асноўная небяспека беларускім землям цяпер пагражала з усходу, але ўсходняя мяжа ад Гародні была далёка. Пасля смерці Вітаўта Стары замак пэўны час быў адной з сядзібаў вялікіх князёў. У 1445 годзе ў замак да вялікага князя Казіміра Ягелончыка прыбыло польскае пасольства, каб паднесці яму польскую карону.

На самай старажытнай выяве беларускага горада — гравюры Гародні 1568 года — ёсць і першая выява Старога замка, збудаванага ў часы Вітаўта. Нават на малюнку ён уражвае сваім суровым і непрыступным выглядам. Адразу відаць, што будавалі яго не для раскошы, а для абароны. Высокі пагорак з крутымі схіламі, а на ім — моцныя мураваныя сцены, магутныя вежы з вузкімі байніцамі. Выдзяляецца формамі і памерамі круглая вежа, збудаваная яшчэ ў 13 стагоддзі.

На тым жа малюнку на суседнім узвышшы паказаны Ніжні замак: ад яго ўмацаванняў засталіся толькі руіны мураваных сцен. Сярод будынкаў адзін выдзяляецца памерамі. Гэта «каралеўскі дом». Ён збудаваны каля сярэдзіны 15 стагоддзя пад жыллё для вялікіх князёў.

## ЗАМАК СТЭФАНА БАТОРЫЯ

У 70-я гады 16 стагоддзя Стары замак быў значна перабудаваны па загаду караля Рэчы Паспалітай Стэфана Баторыя. Перабудова зрабіла замак больш прыстасаваным для жыцця караля і яго двара, але ён не перастаў быць магутным абарончым збудаваннем. Кіравалі перабудовай архітэктары з Італіі. Яны пастараліся захаваць пабудовы Вітаўта і толькі перарабілі іх паводле патрабаванняў свайго часу. Амаль цалкам былі выкарыстаны муры старога гатычнага* замка. Толькі дзве вежы — уязную і круглую — разбурылі і перарабілі. Амаль усе абарончыя сцены захаваліся. Сам палац стаяў на гатычных мурах старога палаца. Атрымалася спалучэнне двух стыляў: рэнесансавы** палац, вежы і гатычныя сцены, сам план замка таксама застаўся гатычным. Турма была перанесена з-пад брамнай вежы на тэрыторыю Новага замка.

Дакументы 17 стагоддзя даюць уяўленне аб размяшчэнні пабудоў у замку і аб тым, як выглядалі ўнутраныя памяшканні палаца. Знешні выгляд палаца і замка Стэфана Баторыя мы можам толькі ўяўляць, бо апісанняў няма, а сам замак моцна зруйнаваны.

Гаспадарчая частка: жыллё для прыслугі, пякарня, склады, вазоўня і ўсё іншае — размяшчалася на першым паверсе будынкаў каля сцяны з боку Нёмана. Частка

---

* Готыка, гатычны стыль — стыль мастацтва, пашыраны ў Еўропе ў 12—15 стагоддзях.

** Рэнесанс — у гэтым выпадку архітэктурны стыль, які прыйшоў на Беларусь у 16 стагоддзі.

пабудоў з боку Нёмана была двухпавярховай. У вежы над брамай размяшчалася капліца. На другім паверсе тых пабудоў знаходзілася каралеўская лазня з прыгожай алебастравай залай (потым зменена на мармуровую). Над гэтай залай на трэцім паверсе размяшчалася яшчэ адна зала з 16 вокнамі.



*Сцяпан Батура (кіраваў у 1576—1586 гг.)*

Галоўным будынкам у замку з'яўляўся палац. Ён меў прамавугольную форму (60×21 метр). Першы паверх быў прызначаны напалову для вайсковых, напалову для гаспадарчых патрэб. Таму выгляд пакояў тут быў просты і суровы. Магутныя паўкруглыя скляпенні, гладкія тынкаваныя сцены, выкладзеныя з цэглы падлогі, дубовыя або жалезныя дзверы. Зрэдку можна было ўбачыць печ або камін. Частка пакояў служыла для размяшчэння залогі, для гэтага маглі выкарыстоўвацца таксама сутарэнні, якія былі пад гмахам. У іншых пакоях трымалі зброю, ваенны і конскі рыштунак, розныя прылады і матэрыялы. Самы меншы пакой першага паверха служыў для размяшчэння архіва.

На антрэсолі размяшчалася памяшканне для вартаўнікоў пры варотах. Скарбніцай быў пакой, ізаляваны ад іншых, толькі з адным выйсцем у сені. У ім трымалі сталовае срэбра. Унутры будынка не было пераходу паміж першым і другім паверхамі. Галоўная парадная лесвіца з падворка на другі паверх размяшчалася пасярэдзіне фасада.

Другі паверх займалі каралеўскія пакоі: самыя багатыя і шыкоўныя. Майстры пакрылі столь багатай разьбой, расфарбавалі ў розныя колеры і пазалацілі. Падобная столь была ў каралеўскім палацы на Вавелі ў Крака-


XVI ст.

ве. Дзверы таксама зрабілі разнымі і шматколернымі: «шэра-залацістага» і іншага колераў. У пакоях стаялі мармуровыя і каменныя каміны. Сцены былі пакрытыя пазалотай і шліфаванай тынкоўкай, іх аздаблялі прыгожыя тканіны з арнаментам і габелены, падобныя да вавельскіх. Падлогу выклалі мармуровымі і каменнымі пліткамі, а таксама пліткамі керамічнымі і паліванымі.

У кожным пакоі стаялі печы, зробленыя па італьянскаму ўзору з рэнесансавых маёлікавых кафлін з яркімі фарбамі. Вялікую колькасць гэтых кафлін археолагі знайшлі каля палаца ў час раскопак. Калі ўявім сабе яшчэ розныя старыя побытавыя рэчы: сяцільнікі, лаўкі, сталы, крэслы і інш., то вобраз пакояў караля Стэфана Баторыя будзе папраўдзе поўным.

Кароль Стэфан Баторый упершыню з'явіўся ў Гародні ў 1579 годзе. Тады ўжо пачалася перабудова замка, але невядома, калі яна закончылася. Праз тры гады, калі ў Гародні адбывалася дзяржаўная нарада, то праходзіла яна не на Старым замку, а ў Каралеўскім доме на месцы былога Ніжняга замка. Відавочна, будаўніцтва яшчэ працягвалася.

Археалагічныя раскопкі, праведзеныя на Старым замку ў наш час, паказалі тыповы для сярэднявечча малюнак, калі побач з раскошай ужывалася і крайняя беднасць. Шыкоўны каралеўскі палац вельмі адрозніваўся сваім выглядам ад малюсенькіх драўляных хатак замкавай абслугі. Гэтыя хаткі з невялічкімі дворыкамі займалі ўвесь замкавы двор, яны былі адгароджаныя ад суседскіх такіх жа дворыкаў радамі ўбітых у зямлю бярвёнаў. Вузкія праходы паміж агарожамі пакрываліся абрэзкамі дошак. Шырэйшыя вуліцы — праезды — масціліся драўлянымі плахамі, пакладзенымі ўпоперак. Калі ехалі ад брамнай вежы да палаца, томіналі цэлы рад такіх дамоў. Яны ціснуліся ля самага ганка каралеўскага палаца. Але, паўтараем, у тыя часы такое суседства было звыклым, і на яго не звярталі ўвагі.

Праз нядоўгі час, дзесьці ў канцы 16 — пачатку 17 стагоддзя, замак быў часткова перабудаваны.

Падрабязнае апісанне стану замкавых пабудоў у 17



*Беларускі гусарскі ротмістр (17 ст.)*



стагоддзі дае інвентар — дакумент, які складалі дзяржаўныя камісары з мэтай уліку маёмасці і высвятлення стану яе захавання. Рабілі яны гэта проста — накіроўваліся на замак і па дарозе апісвалі мост, вароты ўязной вежы, замкі на варотах і гэтак далей. Затым заходзілі ва ўсе памяшканні і апісвалі іх: колькі пакояў, дзвярэй, печаў, камінаў і якая маёмасць. Інвентар дапаможа нам зрабіць невялікае падарожжа ў часе і апынуцца на гарадзенскім замку 17 стагоддзя.

З горада ў замак вядуць два масты. Па першым можна трапіць на былы Ніжні замак. Мост гэты драўляны, і падтрымліваецца пяццю мураванымі апорамі. Ён заканчваецца брамай. За брамай знаходзіцца мураваная турма з дубовымі дзвярыма. Праход ад брамы да другога моста абнесены агарожай. Другі мост, які выводзіць непасрэдна да замка, мураваны з 16 вежамі па баках. Брама ў вежы закрытая вялікімі дубовымі варотамі з весніцамі. Вароты замыкаюцца ўнутраным замком. На самой вежы захаваліся сляды прыстасавання для пад'ёму моста.

Уваходзім у двор. Ён застаўлены невялікімі драўлянымі жылымі і гаспадарчымі пабудовамі. Яны займаюць заходнюю палову і цэнтр замкавага двара і абнесены агарожамі. Некаторыя з пабудоў двухпавярховыя. Драўляныя збудаванні падыходзяць да самага ганка, які вядзе да каралеўскага палаца.

З інвентара можна даведацца, што на тэрыторыі замка размяшчалася больш за два дзесяткі драўляных пабудоў. У паўночнай частцы знаходзілася ядальня. Тут жа ў адным з памяшканняў захоўваўся ваенны рыштунак: гарматы, мушкеты, алебарды, шпагі, даспехі.

У гаспадарчых пабудовах трымалі дровы, у адной — дахоўку. Былі яшчэ карэтны хлеў, стайня і розныя іншыя будынкі для гаспадарчых патрэб, а таксама жыллё замкавай абслугі. Замак знаходзіўся тады ў занядбаным стане: складальнікі інвентара пастаянна адзначалі неабходнасць рамонту пабудоў, дзвярэй, печаў і гэтак далей. Ужо была разбурана вежа на мысе над Гараднічанкай.


XVIII ст.

## МІНАЛІ СТАГОДДЗІ

У 1655 годзе замак быў збураны, разрабаваны і спалены маскоўскім войскам. За рускімі прыйшлі яшчэ шведы, і пасля іх замак застаўся ў руінах.

У 1673 годзе ў Гародні вырашана праводзіць агульнадзяржаўныя сеймы. Замак тэрмінова адбудавалі. Працы праводзіліся пад наглядам Крыштапа Паца — канцлера Вялікага княства Літоўскага і дзяржаўцы гродзенскай эканоміі. Асаблівая ўвага была звернута на залы для Сената* і паслоў**.

Залу Сената размясцілі ў палацы на месцы даўняга сталовага пакоя і яшчэ двух пакояў з боку горада. Пасольская зала знаходзілася ў новых памяшканнях, збудаваных з боку Нёмана. Планіроўка астатніх жылых памяшканняў часоў Стэфана Баторыя заставалася без змен.

Ужо ў 1678 годзе ў адбудаваным замку адбыўся першы сейм, на якім прысутнічаў кароль Рэчы Паспалітай Ян III. Пазней у замку адбылося спатканне караля Аўгуста II з рускім царом Пятром I. Яны дамовіліся стварыць саюз супраць шведскага караля Карла XII.

Хоць Пац стараўся аднавіць замак у ранейшым стане, але ў знешнім і ўнутраным выглядзе палаца Стэфана Баторыя адбыліся значныя змены. Не было ўжо эркераў (закрытых балконаў), не было шыкоўных скляпенняў, зніклі каменныя аблямоўкі вокнаў, парталаў, іх замянілі гіпсавымі.

У такім стане Стары замак праіснаваў да 1708 года, калі яго разбурылі шведы ў час Паўночнай вайны. Разбурэнні былі такімі вялікімі, што замак стаў непрыгодным для правядзення з'ездаў, прыёмаў або сеймаў. У 1729—1730 гадах ад пасольскай залы засталіся толькі дзве сцяны, астатнія, падмытыя вадой, рухнулі ў Нёман.

У 18 стагоддзі, падобна пры каралі Аўгусце II, замак

---

* Сенат — палата сейма, складалася з вышэйшых службовых асобаў.

** Пасольская палата складалася з прадстаўнікоў ад шляхты.


XIX ст.

зноў адбудавалі і прыстасавалі для размяшчэння ніжэйшых па чыне прыдворных. Для караля, для сеймаў, прыёмаў, нарад знайшлі будынкі ў горадзе.

Замак паступова прыходзіць у заняпад. У канцы 18 стагоддзя ў ім мясціўся скарбовы трыбунал*. Палац быў пакрыты дахоўкай. На месцы даўняга ганка збудаваны порцік на чатырох калонах з вонкавымі сходамі і балконам — накшталт тэрасы. Стары замак ужо амаль нічым не напамінаў збудаванне часоў Баторыя.

Яшчэ больш ён страціў рысы арыгінальнасці ў 19 стагоддзі, пасля таго як Гародня ўвайшла ў склад Расійскай імперыі. У час паўстанняў супраць царызму ў 1830 і 1863 гадах рускія ўлады размясцілі ў Старым замку турму для паўстанцаў.

Пазней у замку знаходзіліся казармы расійскіх войскаў і афіцэрскага клуба.

У 1920 годзе Гародня апынулася ў складзе Польшчы. У 1925 годзе ў Старым замку быў заснаваны гісторыка-археалагічны музей, які існуе там і зараз.

З 1932 па 1939 гады на замку праведзены першыя вялікія археалагічныя раскопкі пад кіраўніцтвам І. Ядкоўскага, а потым З. Дурчэўскага. Тады і былі адкрыты руіны мураваных збудаванняў 12 стагоддзя: Ніжняй царквы, княжацкага церама, сцяны на мысе над Гараднічанкай.

Высветлена, што з тых часоў, як у Гародню прыйшлі першыя жыхары, узровень зямлі падняўся болей чым на 9 метраў. Гэта адбылося таму, што на невялікай пляцоўцы заўсёды жыло шмат людзей. У выніку іх дзейнасці і накапілася столькі зямлі, якую археолагі называюць культурным слоем. У гэтым слаі вельмі шмат старадаўніх рэчаў, згубленых ці выкінутых іх гаспадарамі. На Старым замку цудоўна захаваліся не толькі гліна, але і косць, дрэва, тканіна, насенне, збожжа, амаль не паржавела жалеза. Знойдзеныя рэчы дапамагаюць археолагам

* Скарбовы трыбунал — установа, якая кантралявала дзяржаўныя даходы і расходы.

аднавіць малюнак жыцця даўніх насельнікаў Старога гарадзенскага замка.

Археалагічныя раскопкі далі багаты матэрыял для рэстаўратараў, якія ствараюць праект аднаўлення замка.

Зараз у Старым замку працуе гісторыка-археалагічны музей, які мае багацейшую ў Беларусі археалагічную калекцыю. Значная частка экспазіцыі прысвечана гісторыі замка. Мы запрашаем вас наведаць гэты прыгожы куточак Беларусі. Вы паходзіце па велічных руінах замкавых муроў, паглядзіце музей і ўбачыце шмат з таго, аб чым мы расказалі.



# ЗМЕСТ

Узнікненне і росквіт паселішча на беразе Нёмана 5
Крыжацкая навала 14
Слаўны рыцар Давыд Гарадзенскі 23
Бітва з крыжакамі працягваецца 25
Міжусобныя звады, і крыжакі ў замку 29
Замірэнне Вітаўта і Ягайлы 31
Замак Вітаўта 32
Замак Стэфана Баторыя 36
Мінaлі стагоддзі 44

Научно-популярное издание

**КРАВЦЕВИЧ Александр Константинович**

**ГРОДНЕНСКИЙ ЗАМОК**

Очерк

Минск, издательство «Юнацтва»
На белорусском языке

Навукова-папулярнае выданне

**КРАЎЦЭВІЧ Аляксандр Канстанцінавіч**

**ГРОДЗЕНСКІ ЗАМАК**

Нарыс

Загадчык рэдакцыі *М. М. Зарэмба.* Рэдактар *У. М. Мазго.* Мастацкі рэдактар *У. М. Жук.* Тэхнічныя рэдактары *З. Г. Сень, Г. Ф. Дуброўская.* Карэктар *Л. К. Паплаўская.*

ІБ № 1498

Здадзена ў набор 01.02.91. Падпісана да друку 10.10.91. Фармат $70 \times 90^1/_{16}$. Папера афс. № 1. Гарнітура Кудрашэўская энцыклапедычная. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 3,51. Ум. фарб. адб. 14,92. Ул. выд. арк. 3,70. Тыраж 12000 экз. Зак. 20.

Выдавецтва «Юнацтва» Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінская фабрыка каляровага друку. 220115, Мінск, Каржанеўскага, 20. Дыяпазітывы тэксту падрыхтаваны Мінскім ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінатам МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.



